В.Е.ЛЯВОНЧЫКАЎ
Р.А.РОВІНА
Р.С.МАТУЛЬСКІ

# Факультэту бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта культуры - 55 гадоў

Факультэту бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага універсітэта культуры (ФБІС БУК) споўнілася 55 гадоў. Цяпер гэта адзіны ў рэспубліцы факультэт, які рыхтуе спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй для бібліятэк Беларусі. Сённяшнія выпускнікі ФБІС БУК атрымліваюць дыпломы з прысваеннем кваліфікацыі "бібліятэкар-бібліёграф", "музеязнаўца" "бакалаўр гуманітарных навук", "магістр гуманітарных навук", "педагог-даследчык", "кандыдат педагагічных навук". Здабытыя ва універсітэце веды, навыкі і уменні дазваляюць ім паспяхова выконваць свае функцыянальныя абавязкі, дабівацца заслужанай павагі карыстальнікаў бібліятэк і наведвальнікаў музеяў.

Станаўленне і развіццё факультэта пачыналася ў цяжкія пасляваенныя гады. Пастановай СНК БССР ад 29 ліпеня 1944 г. у складзе Мінскага педагагічнага інстытута быў створаны бібліятэчны факультэт. У кастрычніку 1944 г. на факультэце пачаліся заняткі з першымі 30 студэнтамі. Паступова колькасць студэнтаў павялічваецца. У канцы 1950-х гг. на факультэце навучалася ўжо больш за 200 студэнтаў. З мэтай павышэння кваліфікацыі працуючых у бібліятэках спецыялістаў у 1950–1960-я гг. на факультэце былі арганізаваны вячэрняе і завочнае аддзяленні і нават экстэрнат.

Адначасова з колькасным ростам студэнтаў фарміраваўся і склад выкладчыкаў факультэта. У 1944–45 гг. у структуры інстытута была адкрыта кафедра бібліятэказнаўства. Паступова, галоўным чынам за кошт выпускнікоў, папаўняўся штат выкладчыкаў. У 1960–1961 гг. адбылася першая рэарганізацыя факультэта – на аснове кафедры бібліятэказнаўства былі створаны 2 кафедры: бібліятэказнаўства і бібліяграфіі. Кафедру бібліятэказнаўства ў складзе 6 выкладчыкаў узначаліла К.Г.Маўрычава, а кафедру бібліяграфіі ў складзе 7 выкладчыкаў – дацэнт М.Ц.Талкачоў. Разам з далейшым павелічэннем колькасці выкладчыкаў павялічваецца і ўзровень іх кваліфікацыі.

Першым дэканам бібліятэчнага факультэта быў І.Б.Сіманоўскі, які шмат зрабіў для падбору выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін і набору студэнтаў. Не меншая заслуга ў арганізацыі вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў Беларусі належыць М.Ц.Талкачову. Ён быў ініцыятарам адкрыцця спецыялізацый "Тэхнічныя бібліятэкі", "Дзіцячыя і школьныя бібліятэкі". Напрыканцы 1950-х гг. дэканам факультэта працавалі старшыя выкладчыкі В.П.Іванова і Н.М.Калоска, якія ўсё жыццё сваё прысвяцілі падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў на факультэце. У 1960-я гг. факультэт узначальваў адзін з першых яго выпускнікоў, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны К.С.Верабей, затым А.Ф.Галуза, таксама выпускнік факультэта (першы выпуск), удзельнік партызанскага руху на Беларусі, энтузіяст бібліятэчнай справы. У снежні 1971 г. дэканам факультэта быў абраны дацэнт В.Е.Лявончыкаў.

Доўгі час падрыхтоўка спецыялістаў на факультэце была універсальнай, накіраванай, галоўным чынам, на патрэбы масавых бібліятэк. У 1960-я гг. былі ўведзены спецыялізацыі па тыпах бібліятэк: "Масавыя і навуковыя бібліятэкі" і "Дзіцячыя і школьныя бібліятэкі", а напрыканцы 60-х гг. было распачата навучанне студэнтаў па спецыялізацыі "Тэхнічныя бібліятэкі", якая прадугледжвала падрыхтоўку спецыялістаў для навукова-тэхнічных бібліятэк рэспублікі. Значная заслуга ў стварэнні гэтай спецыялізацыі належыць канд.пед.навук, дацэнту М.В.Іванову. З 1969–70 гг. на факультэце ствараецца аддзяленне культасветработы па спецыялізацыі "Харавое дырыжыраванне", а некалькі пазней кафедра культурна-асветнай работы .

Новы перыяд у развіцці факультэта звязаны з адкрыццём у



Мінску ў ліпені 1975 г. Мінскага інстытута культуры (МІК). МІК быў створаны на базе бібліятэчнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага і невялікай колькасці студэнтаў аддзялення культурна-асветнай работы Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута. Са стварэннем новай навучальнай установы значна палепшыліся матэрыяльна-тэхнічная база факультэта, умовы працы і навучання выкладчыкаў і студэнтаў.

Акрамя існуючых раней кафедраў бібліятэказнаўства і бібліяграфіі ў 1975 г. на факультэце была створана кафедра тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі, а ў 1978 г. – кафедра дзіцячай літаратуры і бібліятэчнай працы з дзецьмі. Кафедру бібліятэказнаўства ўзначаліў дацэнт В.Ф.Якіменка, кафедру бібліяграфіі – дацэнт В.А.Факееў, тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі – дацэнт Р.А.Ровіна, кафедру дзіцячай літаратуры – дацэнт З.М.Клецкая.

На факультэце па-ранейшаму вялікая ўвага надавалася падбору і фарміраванню прафесарска-выкладчыцкага складу спецыяльных кафедраў факультэта. У канцы 1980-х гг. працэнт выкладчыкаў з навуковымі ступенямі і званнямі складаў на спецыяльных кафедрах 60–70%, што стварыла ўмовы для больш паглыбленай навуковай распрацоўкі праблем бібліятэчнай справы і бібліяграфіі Беларусі.

У другой палове 1980-х гг. адбылася рэарганізацыя спецыяльных кафедраў. На базе кафедраў бібліятэказнаўства і дзіцячай літаратуры былі створаны кафедра бібліятэказнаўства (заг. кафедры – дацэнт У.А.Акуліч) і кафедра фондаў і каталогаў (заг. кафедры – дацэнт Н.А.Ляйко). На базе кафедры бібліяграфіі і тэхнічнай літаратуры ствараюцца тры кафедры: кафедра бібліяграфіі (заг. кафедры – праф. В.Е.Лявончыкаў), кафедра галіновых бібліяграфій і дакументазнаўства (заг. кафедры – дацэнт М.В.Іваноў) і кафедра інфарматыкі і тэхнічных сродкаў (заг. кафедры – дацэнт П.В.Пятрэнка).

У 1983 г. факультэт перайшоў на новы тыпавы вучэбны план, у адпаведнасці з якім спецыялізацыі выдзяляліся не па тыпах бібліятэк, а па галіновых комплексах літаратуры – "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія мастацкай літаратуры", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія грамадска-палітычнай літаратуры", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія тэхнічнай літаратуры", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія сельскагаспадарчай літаратуры", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія дзіцячай літаратуры і літаратуры для юнацтва". У сувязі з шырокім укараненнем у практыку работы бібліятэк аўтаматызаваных тэхналогій была распачата падрыхтоўка кадраў па новай функцыянальнай спецыялізацыі "Методыка выкарыстання сродкаў механізацыі і аўтаматызацыі ў бібліятэчнай справе".

Улічваючы патрэбы бібліятэк рэспублікі ў высокакваліфіка-

ваных кадрах, Міністэрства культуры значна павялічыла набор на факультэт бібліятэказнаўства і бібліяграфіі. У 1980-я гг. толькі на дзённую форму навучання кожны год прымалася каля 200 студэнтаў. Узросшы навукова-педагагічны статус факультэта дазволіў яму рыхтаваць спецыялістаў бібліятэчнай справы не только для Беларусі, але і замежных краін. У 1980-я гг. на факультэце навучалася каля 80 замежных студэнтаў, сярод якіх былі грамадзяне з Анголы, Лаоса, Балгарыі, Манголіі, Конга, Іарданіі, Ірака, Кеніі, Сірыі, Нігерыі, Камеруна, Малі, Танзаніі і іншых краін.

Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні канца 1980-х – пачатку 1990-х гг. аказалі процілеглае ўздзеянне на развіццё факультэта. Факультэт атрымаў магчымасць самастойна распрацоўваць вучэбныя планы, вызначаць пералік вучэбных дысцыплін і іх змест. Разам з тым, у сувязі з адсутнасцю фінансавых сродкаў пачынаецца рэзкае скарачэнне набору на факультэт, змяншэнне агульнай колькасці студэнтаў і выкладчыкаў.

Гэта паслужыла асноўнай прычынай чарговай рэарганізацыі спецыяльных кафедраў факультэта, якая пачалася 1 лютага 1993 г. Раней самастойныя кафедры бібліятэчных фондаў і каталогаў і бібліятэказнаўства былі аб'яднаны ў адну – бібліятэказнаўства (заг. кафедры – дацэнт У.А.Акуліч). Аб'яднанне кафедры галіновых бібліяграфій і дакументазнаўства з кафедрай бібліяграфіі прывяло да стварэння кафедры бібліяграфіі і дакументазнаўства (заг. кафедры - праф. В.Е.Лявончыкаў). Кафедра інфарматыкі і тэхнічных сродкаў была перайменавана ў кафедру аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (заг. кафедры – дацэнт М.А.Яцэвіч). У той жа час змяніў сваю назву і факультэт – ён стаў называцца "Факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм".

Кіраўніцтва факультэтам ў 1975–1993 гг. ажыццяўлялі канд. пед. навук, дацэнт В.Е.Лявончыкаў, канд. філас. навук, дацэнт В.А.Фамін, канд. пед. навук, дацэнт Р.А.Ровіна.

Наступны перыяд у развіцці факультэта звязаны з ператварэннем Мінскага інстытута культуры (ў кастрычніку 1993 г.) у Беларускі універсітэт культуры (БУК). Павышэнне статуса навучальнай установы патрабавала ад прафесарска-выкладчыцкага складу спецыяльных кафедраў факультэта ўдасканальвання існаваўшай у інстытуце сістэмы адукацыі, прынцыповага змянення яе зместу і арганізацыйна-метадычных падыходаў.

Адметнай рысай гэтага перыяду з'яўляецца фарміраванне на факультэце шматузроўневай сістэмы адукацыі, якая ўключае асноўную падрыхтоўку па універсітэцкай праграме, бакалаўрыят і магістратуру. Лепшыя з выпускнікоў, якія маюць здольнасці да навуковай працы, атрымалі магчымасць працягваць навучанне ў аспірантуры і дактарантуры.

Аснову дзейнасці факультэта па-ранейшаму складае падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасці "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія", якая з пачатку 1990-х гг. вядзецца па 10 наступных спецыялізацыях: "Публічныя бібліятэкі", "Навукова-тэхнічныя і спецыяльныя бібліятэкі", "Дзіцячыя і школьныя бібліятэкі", "Кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія старажытнай і рэдкай кнігі", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія, краязнаўства", "Аўтаматызаваныя бібліятэчныя і інфармацыйныя сістэмы", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія, замежная мова", "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура", "Менеджмент і маркетынг бібліятэчнай справы".

З мэтай напаўнення рэальным зместам сістэмы бесперапыннай адукацыі ФБІС БУК разам Магілёўскім бібліятэчным тэхнікумам (МБТ) і Мінскім лінгва-гуманітарным вучэбным комплексам "гімназія-каледж" N 24 (МЛГВК) з 1995 г. пачата рэалізацыя праграмы паскоранай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на базе сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Навучанне ў спецыяльных групах, сфарміраваных на базе лепшых выпускнікоў МБТ і МЛГВК, ажыццяўляецца па асобнаму вучэбнаму плану і працягваецца 3 гады.

Наданне бібліятэчнай адукацыі універсітэцкага статуса патрабавала ўдакладнення структуры і зместу навучання. Факультэтам быў распрацаваны новы вучэбны план, у адпаведнасці з якім тэрмін навучання павялічваўся да 5-ці гадоў, а агульны аб'ём вучэбных заняткаў складаў каля 5000 гадзін. У вучэбным плане знайшлі адлюстраванне агульныя патрабаванні да універсітэцкай адукацыі і спецыфічныя асаблівасці факультэта. З мэтай удасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў супрацоўнікамі факультэта ў 1998 г. таксама быў падрыхтаваны першы адукацыйны стандарт па падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія".

У 1990-я гг. на факультэце не толькі пашыралася падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасці "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія", але і распачата падрыхтоўка па спецыяльнасці "Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры". Першы набор на спецыялізацыю "Музеязнаўства" у межах гэтай спецыяльнасці адбыўся ў 1994 г. З адкрыццём новай спецыяльнасці адбыліся змены і ў структуры факультэта. З факультэта культуралогіі на ФБІС была перададзена кафедра этнаграфіі і фальклору (заг. каф. – праф. В.С.Цітоў), якая пасля рэарганізацыі ў 1998 г. атрымала новую назву – кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства (заг. каф. – праф. А.П.Грыцкевіч).

Павышэнне навуковага ўзроўню выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін дазволіла адкрыць ў БУК у 1993 г. аспірантуру па спецыяльнасці "Бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства", а ў 1999 г. – па спецыяльнасці "Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры". У БУК таксама адкрыта дактарантура па спецыяльнасцях факультэта.

Адкрыццё на факультэце бакалаўрыята, магістратуры, аспірантуры і дактарантуры станоўча паспрыяла на агульны стан навуковых даследаванняў на факультэце. Вынікі навуковай работы выкладчыкаў факультэта знайшлі сваё адлюстраванне ў шэрагу навуковых, даведачных і вучэбна-метадычных выданняў, шматлікіх артыкулах у айчынным і замежным прафесійным друку і дакладах на навуковых канферэнцыях.

Адметнай рысай развіцця факультэта ў 1990-я гг. стала актывізацыя замежных сувязей. Шэраг выкладчыкаў атрымалі магчымасць наведаць бібліятэчна-інфармацыйныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы Венгрыі, Германіі, Нідэрландаў, Польшчы, ЗША і другіх краін, прайсці стажыроўкі ў замежных бібліятэках і ВНУ, выступіць з лекцыямі перад студэнтамі замежных ВНУ. Дзякуючы сувязям з замежнымі партнёрамі студэнты факультэта таксама наведалі Германію, Нідэрланды, Вялікабрытанію, Польшчу, дзе непасрэдна пазнаёміліся з арганізацыяй работы бібліятэк гэтых краін.

У гэты перыяд актывізаваўся ўдзел выкладчыкаў факультэта ў рабоце шматлікіх міжнародных канферэнцый. Пашырэнне замежных кантактаў дазволіла запрашаць замежных калег на факультэт для чытання лекцый студэнтам, прыступіць да рэалізацыі сумесных праектаў.

Аднак разам са станоўчымі тэндэнцыямі ў гэты перыяд развіцця факультэт сустрэўся і з шэрагам праблем, асноўнымі сярод якіх з'явіліся скарачэнне колькасці студэнтаў і выкладчыкаў, кадравая праблема і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне вучэбнага працэсу.

У першай палове 1990-х гг. кіраваць факультэтам працягвала Р.А.Ровіна. Пасля пераходу яе на пасаду начальніка вучэбнага аддзела БУК дэканам стаў канд. гіст. навук, дацэнт А.А.Трусаў. У лютым 1998 г. на пасаду дэкана ФБІС БУК прызначаны канд. пед. навук, дацэнт Р.С.Матульскі.

Такім чынам, развіццё факультэта ў перыяд з 1993 па 2000 гг. характэрызуецца супрацьлеглымі тэндэнцыямі. З аднаго боку, на факультэце значна пашырыўся пералік спецыяльнасцей і спецыялізацый, па якім вялася падрыхтоўка кадраў, адкрыліся бакалаўрыят, магістратура, аспірантура і дактарантура, пашырыліся замежныя сувязі і ўзрос узровень навуковай работы. З другога боку, працягваўся працэс скарачэння колькасці студэнтаў і выкладчыкаў, які ўдалося стабілізаваць толькі ў канцы 1990-х гг., амаль прыпыніўся прыток новых кадраў выкладчыкаў, патрабавала ўдасканалення забеспячэнне вучэбнага працэсу сучаснымі тэхнічнымі сродкамі, асабліва

камп`ютэрнай тэхнікай.

За час існавання факультэт падрыхтаваў больш за 12 тысяч спецыялістаў у галіне бібліятэчнай і музейнай справы. Няма такой бібліятэкі ў нашай рэспубліцы, дзе б ні працавалі выпускнікі факультэта. Яны працуюць таксама ў бібліятэчна-інфармацыйных установах Балгарыі, Венгрыі, ЗША, Расіі, Украіны і іншых краін. Мы ганарымся нашымі славутымі выпускнікамі, сярод якіх вядомыя пісьменнікі, навукоўцы, палітыкі. Амаль усе буйнейшыя бібліятэкі Беларусі – Нацыянальную бібліятэку Беларусі, Цэнтральную навуковую бібліятэку імя Я.Коласа НАН Беларусі, Рэспубліканскую навукова-тэхнічную бібліятэку, Прэзідэнцкую бібліятэку, Рэспубліканскую навукова-педагагічную бібліятэку, Рэспубліканскую навукова-метадычную бібліятэку па фізічнай культуры, а таксама Нацыянальную кніжную палату і іншыя бібліятэчна-інфармацыйныя ўстановы ўзначальваюць былыя выпускнікі факультэта. Асабліва трэба адзначыць такіх знакамітых выпускнікоў факультэта, як Герой Савецкага Саюза А.Р.Мазанік, начальнік упраўлення адміністрацыі Прэзідэнта Л.П.Гуляка, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык аддзела гуманітарных навук БелВАК А.Н.Сарокін, загадчык аддзела прозы часопіса "Полымя", пісьменнік А.М.Федарэнка, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Г.М.Алейнік.

Станоўчыя вынікі развіцця факультэта дазваляюць верыць у яго будучыню. Спадзяемся, што выкладчыкі факультэта і далей будуць працягваць падрыхтоўку спецыялістаў, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням практыкі, а набытыя на факутэце веды стануць надзейным падмуркам у жыцці для яго выпускнікоў.